УДК 39+398

# СТЫЛІЗАЦЫЯ ЯК МЕТАД УВАСАБЛЕННЯ НАРОДНАГА АБРАДУ

***Н. В. Петухова,***
*кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Разглядаецца сутнасць стылізацыі як метаду ўвасаблення народных абрадаў і свят. Метад стылізацыі як спосаб працы з фальклорным матэрыялам адлюстроўвае эстэтычнае пераасэнсаванне святочнага дзеяння і кірунак арганізацыі свята. Раскрываюцца прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца ў ідовішчы. У выніку чаго трансфармуецца дынаміка развіцця народнага свята, дзе традыцыйныя формы народнага гуляння суіснуюць з рэжысёрскімі прыёмамі стварэння святочнага настрою, актывізацыі аўдыторыі і адмысловым музычным і мастацка-дэкаратыўным вырашэннем.

**Ключавыя словы:** фальклор, свята, культура, народны, песня, гульня, карагод, мерапрыемства, рытуал, мастацтва, творчасць.

# STYLIZATION AS A METHOD OF EMBODYING A FOLK RITUAL

***N. Petukhova,***
*PhD in Pedagogy, Head of the Department of Directing of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the essence of stylization as a method of embodying folk rituals and holidays. The stylization method as a way of working with folklore material, reflects the aesthetic rethinking of a festive event and the management of the organization of the holiday. We talk about the findings, techniques and means of artistic expression used in the performance. As a result, the dynamics of the development of a folk holiday is transformed, where traditional forms of folk festivities coexist with directorial techniques for creating a festive

mood, activating the audience and special musical and artistic-decorative solutions.
**Keywords:** folklore, holiday, culture, folk, song, game, carousel, event, ritual, art, creativity.

Народныя абрады і святы з'яўляюцца неад'емнай часткай духоўнай спадчыны беларускага народа. Яны адлюстроўваюць этнакультурныя традыцыі, сацыяльныя стэрэатыпы паводзін і мыслення, увасабляюць вераванні і ідэалы грамадства. Нягледзячы на тое, што фальклорныя элементы знікаюць з побыту людзей, ва ўстановах культуры краіны штогод узнаўляюцца такія святы, як Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Купалле, Дажынкі і інш., якія дэманструюць разнастайныя сферы народнай мастацкай творчасці і ўзровень мастацкай асэнсаванасці той ці іншай фальклорнай з'явы.

На дадзены момант існуюць некалькі метадаў увасаблення народных абрадаў – рэстаўрацыя, рэканструкцыя і стылізацыя [1; 3; 4]. Калі рэстаўрацыя і рэканструкцыя накіраваны, у першую чаргу, на даследаванне рэгіянальных асаблівасцей пэўнага традыцыйнага абраду і яго аднаўленне ў натуральным прыродным ландшафце, то метад стылізацыі як тып тэатралізаванага прадстаўлення адлюстроўвае эстэтычнае пераасэнсаванне святочнага дзеяння.

У гэтым сэнсе, на наш погляд, стылізацыя адкрывае шырокія магчымасці для творчасці рэжысёра, паколькі яна дазваляе выявіць яго адносіны да той ці іншай фальклорнай з'явы і прадэманстраваць уласны стыль. Інакш кажучы, рэжысёр становіцца сааўтарам народа. Ён не проста ўзнаўляе традыцыйны абрад, але шукае эстэтычныя сродкі выразнасці, каб раскрыць яго міфалагічную аснову. Можна сказаць, што «стылізацыя быццам балансуе паміж дакладным узнаўленнем абраду, якое блізкае да пераймання, і ў той жа час адпіхваецца ад гэтага ўзнаўляемага аб'екта ў сферу мыслення, успрыняцця і выразных сродкаў, якімі валодае рэжысёр» [2, с. 18].

Даследчык А. М. Аляхновіч вылучае наступныя прынцыпы выкарыстання метаду стылізацыі пры стварэнні сцэнарыя народнага абраду:

– тыпізацыя – знаходжанне найбольш характэрных, дамінуючых рыс народнага абраду (напрыклад «гульня з Казой» на Каляды);

– індывідуалізацыя – вызначэнне вонкавых прымет і адзнак, якія дазваляюць асэнсаваць асаблівае і абагульніць яго;

– ідэалізацыя – мастацка-эстэтычнае бачанне, якое дазваляе максімальна акцэнтаваць увагу на пэўных рысах абраду (напрыклад ідэалізацыя вясковага жыцця);

– гіпербалізацыя – прыём мастацкай вобразнасці, пры якім дасягаецца ўзмацненне дынамікі, стварэнне асаблівай эмацыянальнасці, экспрэсіўнасці выканальніцкай манеры [2, с. 20].

Выкарыстанне дадзеных прынцыпаў пры ўвасабленні народнага абраду дазваляе знайсці нестандартнае сцэнарна-рэжысёрскае вырашэнне святочнай дзеі, па-новаму выкарыстоўваючы такія спецыфічныя рысы фальклору, як традыцыйнасць, вуснасць, калектыўнасць, варыятыўнасць і сінкрэтызм. У выніку чаго трансфармуецца дынаміка развіцця народнага свята, дзе традыцыйныя формы народнага гуляння суіснуюць з рэжысёрскімі прыёмамі стварэння святочнага настрою, актывізацыі аўдыторыі і адмысловым музычным і мастацка-дэкаратыўным вырашэннем. Такое творчае пераасэнсаванне народнага абраду трансфармуе яго ў відовішча, якое далучае гледача да міфапаэтычнага сэнсу абрадавых дзей, яднае сучаснае і мінулае, эстэтычнае і прагматычнае, калектыўнае і індывідуальнае.

Для стварэння сцэнарыя стылізаванага абраду выкарыстоўваюцца метафары, эпітэты, параўнанні і іншыя сродкі фальклорнай паэтыкі, а таксама пэўныя, замацаваныя традыцыяй абрадавыя дзеянні, мастацкія матэрыялы (гульні, песні, танцы, карагоды, выказванні). З пэўным стаўленнем да падзей і герояў выступае мастацкае слова, якое апавядае пра падзеі, што непасрэдна адбываюцца перад гледачом. Усе творы аб'ядноўваюцца агульным сюжэтам, дзе маюць значэнне строгая лагічнасць пабудовы тэмы, нарастанне дзеяння, закончанасць кожнага асобнага эпізоду і раскрыццё зместу гульнёвых, карагодных, танцавальных нумароў і народных песень. Шырока выкарыстоўваюцца паказ розных старонак з народнага жыцця, фрагментаў абраднасці, а таксама падрыхтоўка адпаведных атрыбутаў народнага мастацтва і побыту (інструментаў, касцюмаў, прадметаў быту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва).

Такім чынам, для метаду стылізацыі характэрна пераасэнсаванне абрадава-святочнай культуры, калі рэжысёр, ствараючы фальклорнае свята, раскрывае на новым эстэтычным узроўні прыродную сутнасць традыцыі. Для рэжысёра сцэнарый – гэта не проста паслядоўнасць святочных і абрадавых дзеянняў, а

драматургічна распрацаваны план, у якім, безумоўна, абрадавае дзеянне пераўтвараецца ў тэатралізаванае.

1. *Аляхновіч, А. М.* Абрадавае тэатралізаванае прадстаўленне ў праграме свята: праблемы тыпалогіі / А. М. Аляхновіч // Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай культуры : матэрыялы навук. канф., Мінск, 23–24 лістап. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 46–54.

2. *Аляхновіч, А. М.* Спецыфіка стылізацыі абраду / А. М. Аляхновіч // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2014 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2016. – С. 16–21.

3. *Гутько, О. Л.* Обряд как источник праздничного действа / О. Л. Гутько // Вести Института современных знаний. – 2014. – № 1. – С. 38–43.

4. *Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду : вучэб.-метад. дапаможнік / А. Я. Камінскі. – Мінск : [б. в.], 2009. – 110 с.